зея видится в развитии гибридной модели, где технологическая эффективность и аналитическая мощь искусственного интеллекта находятся в балансе с критическим мышлением, эмпатией и авторским взглядом человека-профессионала.

1. Rembrandt Database [Электронный ресурс]. – [The Hague], 2024. – URL: https://rembrandtdatabase.org (date of access18.09.2025).
2. Parry, R. Museums in a Digital Age / R. Parry. – London : Routledge, 2010. – 496 p.
3. Bowen, J. P. Museums and Digital Culture: New Perspectives and Research / J. P. Bowen, T. Giannini. – New York : Springer, 2019.
4. Научно-образовательный портал НИУ ВШЭ : [сайт]. – Санкт-Петербург, 2024. – URL: https://spb.hse.ru/news/910942472.html (дата обращения 18.09.2025).
5. Медиапортал исторического музея: [сайт]. – Москва, 2025. – URL: https://mediashm.ru/?p=50417 (дата обращения 19.09.2025).

**Давідоўская В.М.**

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ І ВЫПАДКОВЫЯ НУМІЗМАТЫЧНЫЯ ЗНАХОДКІ Ў ЗБОРЫ ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ (ПАСТУПЛЕННІ 1944–2024 ГГ.)

*Ключавыя словы:* археалогія, выпадковыя знаходкі, нумізматыка, скарбы, Віцебская вобласць

Значную частку збору Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (далей ВАКМ) складаюць прадметы нумізматыкі – больш за 36 тысяч манет. Фарміраванне нумізматычнай калекцыі адбывалася на працягу ўсяго перыяду існавання музея, пачынаючы з моманту яго стварэння ў лістападзе 1918 года, і працягваецца ў цяперашні час. Частка прадметаў нумізматыкі з'яўляецца археалагічнымі і выпадковымі знаходкамі. Яны неаднаразова станавіліся аб'ектамі даследавання навукоўцаў, музейных работнікаў, шырока выкарыстоўваюцца ў экспазіцыйнай дзейнасці музея. Аднак сістэматызацыя, навуковы агляд гэтай часткі нумізматычнага збору музея да сённяшняга часу не былі зроблены.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца археалагічныя і выпадковыя нумізматычныя знаходкі, якія паступілі ў ВАКМ напрацягу пасляваенных дзесяцігоддзяў, пачынаючы з ліпеня 1944 г., калі музей аднавіў работу пасля вызвалення Віцебска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і заканчваючы сённяшнім днём (канец 2024 г.) [1]. Такія храналагічныя межы абумоўлены тым, што даваенная частка калекцыі музея часткова была згублена падчас Вялікай Айчынай вайны, а даваенная пашпартызацыя прадметаў (уліковыя дакументы) у большасці страчана, што не дазваляе зрабіць глыбокі дэталёвы аналіз той часткі даваеннай калекцыі, якая захавалася да сённяшняга часу.

Першае паступленне манет, знойдзеных падчас правядзення **археалагічных раскопак абоназіранняў**, адбылося ў 1970 г. Інстытут гісторыі АН СССР перадаў у музей грыўну, знойдзеную археолагам Л.В. Аляксеевым у 1965 г. на раскопках Друцкага гарадзішча (Талачынскі раён Віцебскай вобласці; КП 016443/125). Увесь комплекс, перададзены ў музей, складаецца з 138 прадметаў, сярод якіх – прадметы побыту і ўзбраення, прылады працы, элементы конскай вупражы.

У наступныя гады ў музей паступілі іншыя праметы нумізматыкі, выяўленыя Л.В. Аляксеевым пры раскопках на тэрыторыі Талачынскага раёна. Сярод іх чатыры дзірхемы Арабскага Халіфата X ст. дынастыі Саманідаў (матэрыялы з раскопак 1969 г. кургана ў в. Багрынава, паступілі ў 1972 г.; КП 016991/07–10).

Яшчэ адзін комплекс матэрыялаў з раскопак Л.В. Аляксеева паступіў у музей у 2021 г. – восем манет з раскопак Друцка 1956–1966 гг. (КП 027568/01–07): пражскі грош каралеўства Чэхіі (Вацлаў IV (1378–1419)), дэнарый, паўгрошы ВКЛ (Жыгімонт

І Стары (1506–1548), Жыгімонт ІІ Аўгуст (1544–1572)), солід Рэчы Паспалітай (Ян ІІ Казімір (1648–1668)), дзенга Рускага царства (Іван IV Жахлівы (1547–1584)).

На працягу 1944–2024 гг. у музей паступалі нумізматычныя знаходкі, выяўленыя падчас работы іншых вядомых беларускіх археолагаў – Г.В. Штыхава, В.М. Ляўко, Т.С. Бубенькі, А.В. Вайцяховіча, І.А. Цішкіна. Большасць з гэтых прадметаў знойдзена падчас раскопак на тэрыторыі Віцебска – былых Ніжняга і Узгорскага замкаў, на тэрыторыі Задзвіння.

У 1973 г. Інстытут гісторыі НАН БССР перадаў комплекс з 167 прадметаў, знойдзеных на тэрыторыі Ніжняга замка падчас раскопак пад кіраўніцтвам Г.В. Штыхава. Гэта былі рэчы рознага прызначэння: бранзалеты XII–XIII ст., бусіны X–XI ст., цагляныя сасуды, люлькі XVIII–XIX ст., прасліцы X–XIII ст. З раскопак 1965–1966 гг. у музей паступіла чатыры манеты: дзенга 1744 г. Расійскай імперыі, тры соліды (барацінкі) Рэчы Паспалітай XVII ст. (КП 17208/117–120), з раскопак 1972 г. – тры манеты Расійскай імперыі: 1 капейка 1768 г., 5 капеек 1763 (?) г. і з нечытаемым годам (КП 17208/150,151,153).

У 2008 г. у музей паступілі манеты, знойдзеныя на тэрыторыі былога віцебскага Узгорскага замка і на тэрыторыі Задзвіння падчас раскопак 1991 г. пад кіраўніцтвам В.М. Ляўко. У комплексе рэчаў рознага прызначэння (абцас, гандлёвыя пломбы, грэбень XVIII–XIX ст., мундштукі XVII ст.), знойдзеных на вул. Талстога, знаходзілася чатыры манеты: палушка 1731 г., дзенга 1750 г. (?), 1 капейка 1898 г. Расійскай імперыі і паўкапейкі 1925 г. СССР (КП 24527/12,13, НД 10774/10,11).

Пасля правядзення ў тым жа годзе раскопак на тэрыторыі Задзвіння (раён вуліц Ільінскага і Камсамольскай) у музей былі перададзены 12 манет: рыжскі солід 1-й паловы XVII ст., два соліды Рэчы Паспалітай Яна ІІ Казіміра Вазы; палушка 1731 г., дзенга 1733 (?) і 1750 (?) гг., 1 капейка 1841 г., 1897 г., 2 капейкі 1913(1915) г. і 1916 г., 5 капеек 1860 г. Расійскай імперыі (КП 24527/14–19, НД 10774/12–17). Манеты былі знойдзены побач з фрагментамі цагляных сасудаў XVIII–XIX ст.

Неаднаразова ў музей перадаваліся прадметы, знойдзеныя падчас раскопак, якія праходзілі пры ўдзеле і пад кіраўніцвам Т.С. Бубенькі на тэрыторыі былога Ніжняга замка ў Віцебску. Пасля раскопак 1981–1983 гг. у музей паступіла 28 манет, у тым ліку пражскі грош Карла І (1346–1378), соліды Рэчы Паспалітай Яна ІІ Казіміра Вазы 1660 г. (14 адз.); дзенгі 1731–1752 гг. (10 адз.), 1 капейка 1767 г., 2 капейкі 1761 г., 5 капеек 1790 г. Расійскай імперыі (КП 19668/01–28).

З раскопак Т.С. Бубенькі 1990-х гг. у музей было перададзена некалькі комплексаў прадметаў. Сярод іх варта адзначыць два вялікія комплексы, знойдзеныя каля Дабравешчанскай царквы. Першы складаецца з 234 прадметаў, большасць з іх – фрагменты сасудаў. Таксама прысутнічаюць мундштукі люлек, грузілы, фрагменты фрэсак, манеты. Апошнія прадстаўлены літоўскімі і польскімі солідамі (барацінкамі) Рэчы Паспалітай Яна ІІ Казіміра Вазы і расійскімі дзенгамі Ганны Іаанаўны (усяго 11 манет; НД 10123/235–245). Другі вялікі комплекс прадметаў налічвае 245 адзінак, сярод якіх – сем манет: паўгрошы Жыгімонта І Старага (1506–1548), грош каралеўства Чэхіі Вацлава IV (1378–1419), чатыры соліды (барацінкі) Рэчы Паспалітай Яна ІІ Казіміра Вазы, дзенга 1737 г. Расійскай імперыі (КП 22517/01,02: НД 9915/01–05).

Шэраг прадметаў паступіў у музей пасля раскопак, праведзеных у 2000 г. падчас аднаўлення Уваскрасенскай (Рынкавай) царквы на тэрыторыі былога віцебскага Узгорскага замка ў Віцебску. Археолаг І.А. Цішкін перадаў у фонды фрагменты гаршчкоў з цэглы, два кальцы і пярсцёнак з металу, фрагмент падсвечніка XVII–XVIII ст., а таксама 16 манет, сярод якіх – палушка (1731 г.), дзенгі (1741, 1743, 1754, 1766 гг.), 2 капейкі (175?, 1810, 1813, 1830(?) гг.) Расійскай імперыі; польскія і літоўскія

соліды, трохграшовік, шасціграшовік Рэчы Паспалітай XVII–XVIII ст. (КП 023519/10–18, НВ 010182/06–12).

У 2005 г. археолаг А.В. Вайцяховіч перадаў ў музей дзірхем дынастыі Саманідаў перыяду праўлення Насра ібн Ахмада (914–943 гг.; КП 24345/38). Манета была знойдзенымі падчас раскопак курганнага могільніка ў вёсцы Вітунічы Докшыцкага раёна ў 2004 г. і перададзена ў комплексе з іншымі прадметамі, сярод якіх – паясныя накладкі IX–X стст. салтаўскай археалагічнай культуры, крэсіва, нож, два гаршчкі X ст.

Усяго за перыяд 1944–2024 гг. у музей паступіла 115 манет, знойдзеных падчас правядзення археалагічных раскопак або назіранняў. Манет, якія паступілі ў музей у якасці **выпадковых знаходак**, удвая больш – 236 адзінак. Яны былі знойдзены ў розны час на тэрыторыі Дубровенскага, Полацкага, Сенненскага, Лёзненскага, Віцебскага, Шумілінскага, Міёрскага раёнаў Віцебскай вобласці, у г. Віцебску, а таксама ў г. Горкі Магілёўскай вобласці.

Першае такое паступленне адбылося ў 1946 г., калі жыхар Дубровенскага раёна перадаў у фонды расійскія капейкі Лізаветы Пятроўны, Аляксандра I, Аляксандра II і Мікалая II, знойдзеныя на беразе Дняпра – усяго 6 адзінак (КП 7337/01–06).

З Шумілінскага і Полацкага раёнаў у 1950-х гг. у музей паступіла па адной манеце: срэбраны дукат 1695 г. Галандскай рэспублікі правінцыі Заходняя Вестфрызія (КП 012512) і солід г. Рыгі 1706 г. (КП 012223) адпаведна. Першая манета была знойдзена на полі трактарыстам, другая – чальцамі пажарнай каманды в. Ветрына падчас рыцця катлавана.

Варта адзначыць знаходкі, якія паступілі ў музей з Сенненскага раёна. Найбольш каштоўнымі з іх з'яўляюцца два «яфімкі з прыкметай», знойдзеныя на агародзе дома жыхаром в. Баравікі (КП 013189/01,02). Манеты былі перададзеныя ў музей у 1960 г. Адзін яфімак – надчаканка на талеры Саксоніі 1607 г. (курфюрст Крысціян II і ягоныя браты Іаган Георг I і Аўгуст, 1591–1611), другі – на талеры княства Браўншвейг-Вольфенбютэль 1622 г. (Фрыдрых Ульрых, 1591–1634). Гэтыя манеты дапоўнілі музейную калекцыю яфімкаў, якая налічвае ўсяго 14 экземпляраў (астатнія 12 – з даваеннага збору).

З Сенненскага раёна ў музей паступіла яшчэ некалькі выпадковых знаходак: у 1956 і 1991 гг. – соліды Рэчы Паспалітай 1661 і 1668 гг. (КП 012224, КП 021637), у 1957 г. – сем паўгрошаў Вялікага Княства Літоўскага праўлення Жыгімонта II Аўгуста (КП 012420/01–07). Гэтыя манеты былі знойдзены ў зямлі падчас сельскагаспадарчых работ. У 1977 г. у музей былі перададзены пяць талераў Іспанскіх Нідэрландаў 1625–1672 гг., знойдзеных на беразе Сенненскага возера (КП 017889/01–05).

Найбольш багата адзінкавых знаходак паступіла ў музей з Віцебскага раёна – 23 манеты. Сярод іх варта адзначыць дзірхем Арабскага Халіфата, які быў знойдзены ў 2013 г. каля в. Гатушкі (КП 026184/03), а таксама комплекс з 18 манет, знойдзеных падчас земельных работ у в. Васюты: 1, 2, 5, 20 капеек 1704–1880-х гг., дзенгі 1736–1750-х гг. Расійскай імперыі; соліды Рэчы Паспалітай Жыгімонта II Аўгуста, солід Рыгі Карла X Густава (НВ 011788/01–18).

Цікавыя і каштоўныя манеты былі знойдзены на тэрыторыі г. Віцебска. Сярод іх тры дзірхемы Арабскага Халіфата. Адзін знойдзены каля Дабравешчанскай царквы (Абасіды, ал-Махдзі, 776–785 гг.; паступіў у музей у 2015 г.; КП 026725), два – каля ракі Зах. Дзвіны (Абасіды, Харун ар-Рашыд, 786–809 гг.; паступіў у 1973 г., КП 017210/01; другі дзірхем не атрыбутаваны, паступіў у 2009 г., КП 025040).

Каштоўным папаўненнем фондаў стала залатая манета 5 рублёў 1897 г., знойдзеная ў 1992 г. падлеткам у двары дамоў №№ 2, 2а па ул. Савецкай у траншэі (КП 021873), талер 1661 г. Свяшчэннай Рымскай імперыі (г. Безансон), знойдзены ў 1957 г.

на беразе Зах. Дзвіны пры будаўніцтве дома (КП 012538), срэбны грывеннік 1748 г. Лізаветы Пятроўны, знойдзены ў 1971 г. у раёне Клінічных вуліц у зямлі на глыбіні 1 м.

Апошняе паступленне ў музей прадметаў нумізматыкі, выпадкова знойдзеных на тэрыторыі Віцебска, адбылося ў 2023 г. Падчас земляных работ па ўстаноўцы скульптурнай кампазіцыі перад будынкам Ратушы было знойдзена сем манет, у т.л. паўгрошы, грош, соліды Рэчы Паспалітай праўлення Жыгімонта III Вазы (1587–1632) і капейка Рускага царства Івана IV Жахлівага (КП 027854/09–15).

Да манет, паступіўшых у музей у якасці выпадковых знаходак, далучаюцца прадметы нумізматыкі з калекцыі вядомага віцебскага мастака Алеся Іосіфавіча Мемуса, перададзенай у дар музею ў 2023 г. Цалкам калекцыя налічвае каля 2000 прадметаў археалогіі, нумізматыкі, прадметаў побыту. Нумізматычная частка збору А.І. Мемуса складаецца з 332 манет рознага перыяду 35 краін. Па словах мастака, амаль палова манет (171 адз.) была знойдзена ім у розныя гады на берагах Зах. Дзвіны ў Віцебску і Полацку. Сярод іх манеты Рускага царства і Расійскай імперыі, манеты РСФСР і СССР (да 1927 г.), ВКЛ і Рэчы Паспалітай, краін Еўропы.

У асобную групу прадметаў, якія паступілі ў музей у 1944–2024 гг., вылучаюцца **скарбы**. За гэты перыяд усяго было прынята на захоўванне 32 скарбы, у т.л. 21 грашовы, 3 грашова-рэчавых, 3 рэчавых, 5 скарбаў папяровых грошай. Геаграфія знаходак грашовых і грашова-рэчавых скарбаў дастаткова шырокая. Адзін быў знойдзены на тэрыторыі Бранскай вобласці СССР, астатнія – на тэрыторыі Беларусі: 5 скарбаў – у Віцебску, 3 – у Віцебскім раёне, па 2 – у Лёзненскім, Сененскім, Полацкім і Аршанскім раёнах, па 1 – у Гарадку, Гарадоцкім, Ушацкім, Лепельскім, Міёрскім, Талачынскім і Чашніцкім раёнах. Паходжанне аднаго скарба не ўстаноўлена.

Усе скарбы на сённяшні дзень прадстаўлены на доўгатэрміновай выставе «Скарбы зямлі віцебскай», якая дзейнічае з 2015 г. і карыстаецца папулярнасцю ў наведвальнікаў. Супрацоўнікамі музея падрыхтаваны каталог выставы[3], але на жаль на сённяшні дзень ён не апублікаваны. Улічваючы гэтыя абставіны, а таксама адзначаючы каштоўнасць і ўнікальнасць кожнага скарбу, бачыцца магчымым у дадзеным даследаванні прадставіць кароткую характарыстыку скарбаў, якія цалкам або часткова складаюцца з манет і маюць дакладна вызначаную легенду:

1. Грашовы скарб пачатку XIX ст. Знойдзены ў 1948 г. у агародзе ў в. Шчоткі Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 76 манет: 2 капейкі Расійскай імперыі (Кацярына II (1762–1796), Павел I (1796–1801)); 5 капеек Расійскай імперыі (Лізавета I (1741–1762), Кацярына II (1762–1796), Аляксандр I (1801–1825)). КП 7457/01–76;
2. Частка грашовага скарбу пачатку XVII ст. Знойдзены ў 1950 годзе ў в. Тросная Камарычскага раёна Бранскай вобласці ў скарбонцы пры абвале склепа. У складзе дэпазіту 3 манеты: капейкі Расійскага царства (Іван Жахлівы (1547–1584), Барыс Фёдаравіч (1598–1605)). КП 7815/01–03;
3. Грашовы скарб XVII ст. Знойдзены ў 1951 г. падчас земляных работ на глыбіні 0,5 м у в. Логі Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 7 манет: патагоны Іспанскіх Нідэрландаў (Філіп IV (1621–1665), Філіп IV (1621–1665), Карл II (1665–1700)); срэбныя дукаты Рэспублікі Злучаных правінцый (Галандскай Рэспублікі) правінцыі Аверэйсэл. КП 7968/01–07;
4. Грашовы скарб 2-й паловы XVIII ст. Знойдзены ў 1956 г. пад падлогай дома ў в. Венцавое Ветрынскага раёна (зараз Полацкага раёна) Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіта 25 манет: патагоны Іспанскіх Нідэрландаў – герцагства Брабант; срэбныя дукаты Рэспублікі Злучаных правінцый (Галандскай рэспублікі) – Утрэхта,

[3] Над стварэннем каталога выставы «Скарбы зямлі віцебскай» працавалі супрацоўнікі ВАКМ В.А. Шышанаў, Н.П. Варламава, Т.Ч. Калеснікава, В.М. Давідоўская.

Гердэрланда, Заходняй Фрысландыі; рыксдаальдэры Рэспублікі Злучаных правінцый (Галандскай рэспублікі) і Батаўскай рэспублікі. КП 12239/01–25;

5. Грашовы скарб XVI ст. Знойдзены ў 1959 г. у зямлі на агародзе ў в. Хацейка Суражскага (зараз Віцебскага) раёна Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 50 манет: паўгрошы Вялікага Княства Літоўскага (Жыгімонт I Стары (1506–1548), Жыгімонт II Аўгуст (1544–1572)). КП 12877/01–50;

6. Скарб папяровых грошай перыяду Кастрычніцкай рэвалюцыі. Знойдзены ў 1962 г. у Віцебску на полі каля былога аэрадрома ў шкляной бутэльцы (у раёне сучаснага пр-та Чарняхоўскага). У складзе дэпазіту дзяржаўныя крэдытныя білеты 5, 10 рублёў узору 1909 г., білеты дзяржаўнага казначэйства 50, 100 рублёў і 1 манета 50 капеек 1912 г. Расійскай імперыі (Мікалай II (1894–1917)). Усяго 38 адзінак, КП 13852/01–37, КП 13853;

7. Грашовы скарб XVII ст. Знойдзены ў 1962 г. на тэрыторыі саўгаса «Адаменкі» Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 150 манет: драйпелькеры, орты Брандэнбурга (маркграфства, у уніі з Прусіяй, Георг Вільгельм (1619–1640)); чвэрць патагона, патагоны Іспанскіх Нідэрландаў (Філіп IV (1621–1665), Альберт і Ізабэла (1598–1621)); 15 крэйцэраў герцагства Лігніц-Брыг-Валау (Крысціян (1639–1672)); драйпелькеры, орты Прусіі (герцагства-леннік Рэчы Паспалітай і герцагства, Георг Вільгельм (1619–1640), Фрыдрых Вільгельм I (1657–1688)); паўлевендаальдэр, левендаальдэры, срэбныя дукаты Рэспублікі Злучаных Правінцый (Галандскай рэспублікі) г. Кампэна, г. Гельдэрна, г. Зволле, правінцыі Вестфрызія; палутараграшовікі, трайныя грошы, шасціграшовікі, орты Рэчы Паспалітай (Жыгімонт III Ваза (1587–1632), Уладзіслаў IV (1632–1648), Ян II Казімір Ваза (1649–1668)); драйпелькеры Шведскай Прыбалтыкі (Густаў II Адольф Ваза (1621–1632), Крысціна Аўгуста Ваза (1632–1654)). КП 13902/001–150;

8. Грашова-рэчавы скарб пачатку IX ст. Знойдзены ў 1962 г. у в. Добрына Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці У складзе дэпазіта 527 срэбных дзірхемаў Арабскага Халіфата дынастый Умайадаў і Абасідаў і 1 шыйная грыўна (востраў Готланд (?), IX ст.). КП 13936/001–527, КП 13937;

9. Грашовы скарб XVIII ст. Знойдзены ў 1966 г. у в. Трубаносы Сененскага раёна Віцебскай вобласці У складзе дэпазіту 175 манет Расійскай імперыі XVIII ст.: 5 капеек Лізаветы I (1741–1761); 5 капеек Кацярыны II (1762–1796). КП 15099/001–175;

10. Грашовы скарб пачатку XX ст. Знойдзены ў 1966 г. у Віцебску падчас будаўніцтва абласной друкарні па вул. Шчарбакова-Набярэжная. У складзе дэпазіту 276 манет: ½, 1, 2, 3, 5 капеек Расійскай імперыі (Аляксандр II (1855–1881), Аляксандр III (1881–1894), Мікалай II (1894–1917)). КП 15100/001–276;

11. Грашовы скарб пачатку XV ст. Знойдзены ў 1968 г. на балоце каля в. Зарэчча Віцебскага раёна Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 78 манет: пражскія грошы Каралеўства Чэхіі (Вацлаў IV (1378–1419)). КП 15592/01–78;

12. Грашовы скарб 1-й чвэрці XVIII ст. Знойдзены ў 1969 г. падчас ачысткі палёў ад хмызняку каля в. Міхайлава Віцебскага раёна Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 321 манета: драйпёлькер Брандэнбурга (маркграфства, у уніі з Прусіяй, Георг Вільгельм (1619–1640)), шасціграшовік Курляндыі (герцагства-леннік Рэчы Паспалітай, Фрыдрых Казімір (1682–1698)); шасціграшовікі Прусіі (герцагства і каралеўства, Фрыдрых Вільгельм I (1640–1688), Фрыдрых III (1688–1701, 1701–1713), Фрыдрых Вільгельм I (1713–1740)); соліды польскія, палутараграшовікі, шасціграшовікі Рэчы Паспалітай (Жыгімонт III Ваза (1587–1632), Ян II Казімір Ваза (1649–1668), Ян III Сабескі (1673–1769)); соліды Шведскай Прыбалтыкі (Крысціна Аўгуста Ваза (1632–1654)). КП 15701/001–321;

13. Грашова-рэчавы скарб пачатку XVII ст. Знойдзены ў Віцебску ў 1971 г. падчас зносу дамоў пабудовы канца XIX – пачатку XX ст. па вул. Леніна. У складзе

дэпазіту 1 заходнееўрапейская фібула XVI – пачатку XVII ст. і 90 манет: соліды (барацінкі) Рэчы Паспалітай (Ян II Казімір Ваза (1649–1668)); солід Шведскай Прыбалтыкі (Густаў II Адольф Ваза (1621–1632)); капейкі Расіі (царства, Пётр I Аляксеевіч (1682–1721)). КП 16806/01–90, КП 16807;

14. Грашовы скарб XVI ст. Знойдзены ў 1969 г. у зямлі на полі каля в. Валосава Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 21 манета: паўгрош Вялікага Княства Літоўскага (Жыгімонт II Аўгуст (1545–1572)); трайныя грошы Рэчы Паспалітай (Жыгімонт III Ваза (1587–1632), Стэфан Баторы (1576–1586)). КП 16952/01–21;

15. Грашовы скарб 1-й паловы XVII ст. Знойдзены ў 1978 г. на агародзе ў в. Мікуліна Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 17 манет: солід літоўскі Рэчы Паспалітай (Жыгімонт III Ваза (1587–1632)); соліды лівонскія і рыжскія Шведскай Прыбалтыкі (Крысціна Аўгуста Ваза (1632–1654), Густаў II Адольф Ваза (1621–1632)). КП 18254/01–17;

16. Грашовы скарб пачатку XX ст. Знойдзены ў 1971 г. у г. Віцебску пад падлогай дома №11 па пр-це Куйбышава. У складзе дэпазіту 645 манет: палушкі, дзенгі, ½ капейкі, 1, 2, 3 і 5 капеек Расійскай імперыі (Пётр I (1682–1725), Ганна Іаанаўна (1730–1740), Лізавета Пятроўна (1741–1762), Кацярына II (1762–1796), Павел I (1796–1801), Аляксандр I (1801–1825), Мікалай I (1825–1855), Аляксандр II (1855–1881), Аляксандр III (1881–1894), Мікалай II (1894–1917)); нотдалер каралеўства Швецыя (Карл XII (1697–1718)). КП 16378/001–645.

17. Грашовы скарб XVII ст. Знойдзены ў 1978 г. у лесе ў 0,5 км ад Аршанскага перакрыжавання па магістралі «Масква-Мінск» у бок Мінска. У складзе дэпазіту 135 манет: соліды Прусіі (герцагства-леннік Рэчы Паспалітай, Фрыдрых Вільгельм (1640–1657)); солід літоўскі Рэчы Паспалітай (Жыгімонт III Ваза (1587–1632)); соліды рыжскія, лівонскія Шведскай Прыбалтыкі (Густаў II Адольф Ваза (1621–1632), Крысціна Аўгуста Ваза (1632–1654), Карл X Густаў (1654–1660), Карл XI (1660–1697); 4 соліды не атрыбуціраваныя з-за дрэннай захаванасці манет. КП 18255/001–135;

18. Грашовы скарб 1-й трэці XVI ст. Знойдзены ў 1978 г. падчас палявых работ на тэрыторыі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці каля дарогі Язна – Полацк пры выездзе з в. Язна ў бок в. Празарокі. У складзе дэпазіту 82 манеты: паўгрошы, грошы Вялікага Княства Літоўскага (Аляксандр Ягелончык (1501–1506), Жыгімонт I Стары (1506–1548)); паўгрошы, грошы Польшчы (каралеўства, Казімір IV Ягелончык (1447–1492)); грошы Прусіі (герцагства-леннік Польшчы, Альберт II (1525–1568)), паўгрошы г. Свідніцы (Людовік II Ягелончык (1516–1526)). КП 18256/01–82;

19. Грашовы скарб XVI ст. Знойдзены ў 1979 г. на паверхні зямлі ў в. Ульянавічы Сененскага раёна Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 37 манет: паўгрошы, грошы Вялікага Княства Літоўскага (Жыгімонт I Стары (1506–1545), Жыгімонт II Аўгуст (1545–1572)); талер Усходняй Фрызіі (Эдзард II, Крыстаф і Іаган (1540–1566)). КП 18362/01–37;

20. Частка грашовага скарбу пачатку XVIII ст. Знойдзены ў 1983 г. у будаўнічай траншэі на вул. Энгельса ў Віцебску ў цагляным гаршчку. У складзе дэпазіту 134 манеты: 1/12 талера курфюршэства Бранденбург (Фрыдрых III (1657–1713)); патагоны Іспанскіх Нідэрландаў (Філіп IV (1621–1665)); шасціграшовікі Прусіі (герцагства, Фрыдрых Вільгельм I (1657–1688)), шасціграшовікі Прусіі (каралеўства, Фрыдрых Вільгельм I (1713–1740), Фрыдрых I (1701–1713)); срэбныя дукаты Рэспублікі Злучаных Правінцый (Галандскай Рэспублікі) правінцыі Аверэйсэл, правінцыі Вестфрызія, г. Зволле, г. Давентер; шасціграшовікі, тымфы Рэчы Паспалітай (Ян II Казімір Ваза (1649–1668), Ян III Сабескі (1676–1696)); талер Санкт-Галлена (Швейцарская канфедэрацыя). КП 19631/001–134;

21. Грашовы скарб 1-й паловы XVII ст. Знойдзены ў 1986 г. на абрыве каля моста праз р. Усвейку падчас земляных работ каля в. Карэвічы Чашніцкага раёна

Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіта 3860 манет: драйпелькеры Брандэнбурга (маркграфства, у уніі з Прусіяй, Георг Вільгельм (1619–1640)); паўгрошы Вялікага Княства Літоўскага (Жыгімонт I Стары (1506–1545)); драйпелькеры, трайныя крэйцары Германскай (Свяшчэннай Рымскай) імперыі (Багіслаў XIV (1620–1637), Іаан III (1601–1625), епіскап Ульрых (1618–1622), Карл II (1587–1617), Генрых Вацлаў (1617–1639) і Карл Фрыдрых (1617–1647) Падэбрады); драйпелькеры Прусіі (герцагства-леннік Рэчы Паспалітай, Георг Вільгельм (1619–1640)); тэрнарыі, соліды, грошы, палутараграшовікі, трохграшовікі, шасціграшовікі Рэчы Паспалітай (Жыгімонт III Ваза (1587–1632), Стэфан Баторый (1576–1586), Ян II Казімір Ваза (1649–1668)); солід, грошы, драйпелькеры, трохграшовікі Шведскай Прыбалтыкі (Густаў II Адольф Ваза (1621–1632), Крысціна Аўгуста Ваза (1632–1654)); эре каралеўства Швецыя (Крысціна Аўгуста Ваза (1632–1654)). КП 20591/0001–3860;

22. Грашовы скарб XVII ст. Знойдзены ў 1990 г. у агародзе ў в. Сцепурова Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 621 манета: соліды Прусіі (герцогства-леннік Рэчы Паспалітай, Георг Вільгельм (1619–1640), Фрыдрых Вільгельм (1640–1657)); двайныя дэнарыі, соліды, грошы, палутараграшовікі Рэчы Паспалітай (Жыгімонт III Ваза (1587–1632), Стэфан Баторый (1576–1586), Ян II Казімір Ваза (1649–1668)); соліды, сучаўскія падробкі солідаў Шведскай Прыбалтыкі (Густаў II Адольф Ваза (1621–1632), Крысціна Аўгуста Ваза (1632–1654)). КП 21460/001–621;

23. Грашова-рэчавы скарб пачатку XX ст. Знойдзены ў 1994 г. на тэрыторыі прадпрыемства «Хімпласт» у г. Гарадок Віцебскай вобласці. У складзе дэпазіту 48 манет: 1, 2, 5, 10, 15, 20 капеек Расійскай імперыі (Мікалай II (1894–1917)); упрыгожванні (фрагмент завушніцы, кулон (?), кальцо, пярсцёнак), прадметы побыту (гадзіннікі, ланцужкі да іх, створка медальёна, бірулька), прадметы сталовага посуду (шчыпцы для кондытэрскіх вырабаў, гарнірная і сталовая лыжкі, смятаннік). Усяго 67 прадметаў, КП 22577/01–67;

24. Частка грашовага скарбу 1-й трэці X ст. Знойдзены ў 1973 г. на правым беразе Заходняй Дзвіны каля в. Казьянкі Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Паступіў у музей у 2009 г. У складзе дэпазіту 6 манет: дзірхемы Арабскага Халіфату дынастыі Саманідаў. КП 25040/01–06.

Такім чынам, археалагічныя і выпадковыя нумізматычныя знаходкі, якія паступілі ў музей за перыяд 1944–2024 гг., складаюць каля паловы ад ўсёй колькасці прадметаў нумізматыкі, паступіўшых за гэты перыяд, – 7066 манет, або 52 %. Манеты, перададзеныя ў музей пасля правядзення археалагічных раскопак або назіранняў, складаюць 115 адзінак; манеты, паступіўшыя ў музей у якасці выпадковых знаходак, – 236 адзінак; манеты, якія ўваходзяць у склад скарбаў, – 6715 адзінак.

Камплектаванне ажыццяўлялася шляхам дарэння, перадачы і закупкі. Прадметы паступалі ад прыватных асоб, а таксама перадаваліся рознымі ўстановамі і арганізацыямі. Манеты, перададзеныя ў складзе вялікіх археалагічных комплексаў, з'яўляюцца важным іх дапаўненнем. Адзінкавыя знаходкі (яфімкі, арабскія дзірхемы, заходнееўрапейскія талеры і інш.) ўзбагачаюць і павышаюць каштоўнасць музейнай калекцыі нумізматыкі. Археалагічныя і выпадковая нумізматычныя знаходкі з'яўляюцца аб'ектамі даследаванняў навукоўцаў, выкарыстоўваюцца ў экспазіцыйнай дзейнасці музея – на доўгатэрміновай выставе «Скарбы зямлі віцебскай», у пастаяннай экспазіцыі «Старажытны Віцебск IX–XIV стст.».

На сённяшні дзень камплектаванне калекцыі нумізматыкі археалагічнымі знаходкамі працягваецца.

1. Віцебскі абласны краязнаўчы музей (ВАКМ). Кнігі паступленняў асноўнага фонда, КП 007337–027967, НД 000001–011788.